других европейских странах, что свидетельствует о новой тенденции в эволюции современной театральной архитектуры.

1. *Анисимов, А. В.* Новые формы театральной архитектуры / А. В. Анисимов // Academia. Архитектура и стр-во. – 2012. – № 2. – С. 50–60.

2. *Броновицкая, А.* Северная архитектура / А. Броновицкая // Искусство. – 2017. – № 2 (601). – С. 24–35.

3. *Грин, И. Ю.* Новые зрелищные пространства Европы / И. Ю. Грин, П. В. Кудреватых // Новые идеи нового века – 2015 : материалы пятнадцатой междунар. науч. конф. : в 3 т. / Тихоокеан. гос. ун-т [и др.] ; редкол.: В. И. Лучкова (отв. ред.) [и др.]. – Хабаровск, 2015. – Т. 2. – С. 113–119.

4. Kilden performing arts centre by ALA Architects // [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.dezeen.com/2012/03/30/kilden-performing-arts-centreby-ala-architects/. – Дата доступа: 01.03.2020.

## СПЕЦЫФІКА ПЕРАСОЎНЫХ ВЫСТАВАК ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫХ МУЗЕЯЎ БЕЛАРУСІ

***М. І. Плаўская,***
*суіскальнік вучонай ступені кандыдата навук*
*установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У канцы XX ст. адбылося пераасэнсаванне ролі музея ў грамадстве. Музей пачаў успрымацца як сімвал культуры, у якім існуюць розныя меркаванні, пункты гледжання, якія вызначаюць як яго знешнія праявы, так і яго глыбінны сацыякультурны сэнс. Пераацэнка каштоўнасцей, якая адбываецца ў грамадстве, прымусіла перагледзець адносіны да культурнай спадчыны, праблематызаваць звыклыя спосабы яе інтэрпрэтацыі. Музеі паступова адыходзяць ад мадэлі, абмежаванай рамкамі музейных калекцый. На першы план выходзяць выстаўкі, якія атрымліваюць значэнне культурнай падзеі. Як правіла, яны суправаджаюцца спецыяльнымі мерапрыемствамі, арыгінальнымі адукацыйнымі праграмамі.

Такім чынам, выставачная дзейнасць становіцца ўсё больш насычанай і разнастайнай за кошт прыцягнення да супрацоўніцтва іншых музеяў, адукацыйных устаноў, прыватных калекцыянераў. Дадаюцца такія функцыі выстаўкі, як прыцягненне ўвагі СМІ, умацаванне знешніх сувязяў, фарміраванне іміджа музея.

На мяжы XX–XXI стст., у эпоху глабальнай інфарматызацыі, адбылося ўскладненне разумення музея і выстаўкі ў прыватнасці. Музей стаў уяўляцца ў выглядзе інфармацыйнага цэнтра, які распрацоўвае і на аснове розных тыпаў крыніц вядзе базы дадзеных па гісторыі, культурнай спадчыне. У гэтай сувязі перад сучаснымі выстаўкамі была пастаўлена мэта вырашэння разнастайных гуманітарных задач: актуалізацыя культурна-гістарычнай памяці, мастацкай, літаратурнай спадчыны, фарміраванне культурнай прасторы і г. д. [1, с. 64–66].

Усе гэтыя выклікі сучаснасці ўскладнілі задачы, якія стаяць перад музейнымі выстаўкамі. Яны заклікаlittleны павысіць эфектыўнасць выкарыстання калекцый музея, вынесці на абмеркаванне актуальныя, у тым ліку сацыяльныя, праблемы, прадстаўляць новыя даследаванні ў профільных навуках.

Сучасныя выстаўкі накіраваны, у першую чаргу, на наведвальнікаў, каб забяспечваць фінансавыя паступленні і выкананне плана, а таксама сацыякультурныя функцыі музея. Яны павышаюць канкурэнтаздольнасць музея на рынку культурна-інфармацыйных паслуг. Менавіта выстаўкі дапамагаюць музею аператыўна вырашаць праблемы і рэагаваць на сацыяльны заказ, уздзейнічаць на ўсе кірункі дзейнасці і забяспечваюць развіццё музея [4, с. 126].

Разам з выстаўкай змяняецца і сучаснае ўспрыманне яе прасторы. Сёння гэта не проста форма дэманстрацыі помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны. Прастора выстаўкі ўяўляецца як форма мастацкай камунікацыі, дзякуючы якой чалавек не толькі ўзбагачае свой культурна-гістарычны і сацыяльны вопыт, але і набывае новы [1, с. 64–66]. Выстаўка з дапамогай разнастайных экспазіцыйных форм завастрае грамадскую цікаўнасць на вечных каштоўнасцях чалавечага быцця, звяртаецца да найбольш хвалюючых з'яў культуры [3, с. 145–150].

На сённяшні дзень для літаратурна-мемарыяльных музеяў можна вылучыць найбольш характэрныя віды выставак: стацыянарныя, перасоўныя, электронныя. Кожны з іх мае свае асаблівасці.

Стацыянарныя выстаўкі ствараюцца ў спецыяльна адведзеных для іх памяшканнях – выставачных залах, як правіла, яны даволі працяглыя па часе. Для іх арганізацыі ствараецца рабочая група, у якую, акрамя музейных супрацоўнікаў, уваходзіць мастак. Такія выстаўкі могуць ствараюцца з уласна музейных калекцый, з калекцый прыватных калекцыянераў, збораў іншых устаноў. Апошнім часам усё больш распаўсюджанымі сталі сумесныя выставачныя праекты.

У ДЛМЯнК адным з найбольш рэзанансных можна назваць выставачных праект-мемарыял «Страчаныя аблічы», прысвечаны літаратарам, пацярпеўшым пад час рэпрэсій 1930–1940-х гг. На ім былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадстаўлены экспанаты са збораў некалькіх музеяў, а таксама з прыватных калекцый.

Таксама трэба адзначыць выстаўку памяці Івана Луцкевіча. Яна была прапанавана задоўга да адкрыцця, і зацікаўленыя асобы прыносілі экспанаты для уключэння ў выстаўку.

Сярод выставак з прыватных збораў трэба сказаць пра выстаўку «Мяжа была пад Менскам». На ёй была прадстаўлена калекцыя Ігара Мельнікава, прысвечаная Першай сусветнай вайне. Яна таксама мела шырокі грамадскі рэзананс.

У ДЛМЯнК дэманструюцца выстаўкі са збораў іншых музеяў, у тым ліку з замежжа. Так, у 2018 г. праходзіла выстаўка «Булгакаў - з'ява незаконная», з музея М. Булгакава (Кіеў). Яна была прымеркавана да Ночы музеяў, і на яе аснове быў падрыхтаваны цэлы комплекс мерапрыемстваў.

Перасоўныя выстаўкі – гэта асобная катэгорыя. Іх можна падзяліць на тры віды: калекцыйная, банерныя, камбінаваныя.

Трэба адзначыць, што калекцыі літаратурна-мемарыяльных музеяў маюць свае асаблівасці. У асноўным – гэта папяровыя носьбіты – рукапісы, а таксама асабістыя рэчы паэтаў і пісьменнікаў, якія патрабуюць асаблівых умоў захоўвання, транспарціроўкі і экспанавання. Таму пастаянна іх перавозіць для экспанавання небяспечна. Дзеля гэтага ствараюцца муляжы, копіі. Акрамя таго, музейныя калекцыі адносяцца да гісторыка-культурных каштоўнасцей, таму іх перавозка за межы краіны звязана з пэўнымі складанасцямі, шэрагам узгадненняў у іншых інстанцыях. Таму сёння яны становяцца даволі рэдкай з'явай, але маюць вялікае значэнне для папулярызацыі музея, для ўмацавання статусу краіны за мяжой. Сярод такіх выставачных праектаў ДЛМЯнК трэба адзначыць» Будзь ЯК», які праходзіў у Латвіі, Украіны, «Два Яны» ў Латвіі.

На сённяшні дзень найбольш распаўсюджанай формай з’яўляюцца банерныя выстаўкі. Шырокі рэзананс мае праект «Янка Купала. Дыялог культур». Для розных краін ствараюцца перасоўныя банерныя выстаўкі. Яны праходзілі ў Польшчы, Сербіі, Украіне, Францыі, Кітаі, Арменіі, Грузіі, і іншых краінах. Неабходна адзначыць, што такія праекты спрыяюць усталяванню міжнародных сувязяў, павышэнню статусу краіны за мяжой.

Трэці від перасоўных выставак – камбініраваны, калі банерныя праекты дапаўняюцца прадметным шэрагам.

Сярод від выставак, актуальных для літаратурна-мемарыяльных музеяў, – электронныя. Яны маюць сваю спецыфіку, якая заключаецца ў тым, што яны экспануюць не самі музейныя прадметы і аб'екты, а іх лічбавыя копіі. Выкарыстанне лічбавых тэхналогій дазваляе статычную



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выяву рабіць аб'ёмнай, дынамічнай, суправаджаць яе тэкстам, музычным акампанементам, вербальнымі каментарыямі. Такім чынам, розныя віды інфармацыі ўздзейнічаюць не толькі на рацыянальную, але і эмацыянальную сферу чалавека.

Гэта дазваляе вызначыць электронную музейную выстаўку як мультымедыйны прадукт – спецыяльна падабраную і арганізаваную прэзентацыю лічбавых копій экспанатаў і дадатковых фактаграфічных апісанняў, статычных і дынамічных візуальных аб'ектаў, гукавога суправаджэння з мэтай публічнай дэманстрацыі карыстальнікам.

Дэманстрацыя музейных электронных выставак здзяйсняецца сродкамі электронных кіёскаў, плазменных панэлей, іншай праекцыйнай тэхнікі, лакальных носьбітаў лічбавай інфармацыі [2].

У ДЛМЯнК электронныя выстаўкі прадстаўлены двума відамі. Першы выкарыстоўваецца непасрэдна ў музеі. Гэта віртуальныя экскурсіі па філіялах музеяў, якія можна наведаць, не пакідаючы музей. Такія экскурсіі суправаджаюцца 3D-візуальным радам, а таксама музычным і гукавым суправаджэннем. Асноўная мэта такіх выставак – зацікаўленне наведвальніка, матывацыя наведаць філіялы.

Другі від электронных выставак у ДЛМЯнК пачаў стварацца ў 2008 г. Яны прыйшлі на змену планшэтным выстаўкам, якія выкарыстоўваліся для чытання лекцый у іншых установах. Іх асноўным недахопам была грувасткасць і праблемы, звязаныя з транспарціроўкай. Таму было вырашана перавесці іх у электронны фармат. Для дэманстрацыі патрэбны толькі камп'ютар і праэктар, які сёння ёсць амаль у кожнай установе.

Асноўным спажыўцом такіх выставак з'яўляюцца школы. На сённяшні дзень і музеям, і школам даводзіцца план па наведвальніках. Аднак школы з аддаленых раёнаў горада, а таксама з іншых населеных пунктаў не заўжды могуць прывезці дзяцей у музей. Таму яны заказваюць электронныя выстаўкі, з якімі прыязджае музейны супрацоўнік і праводзіць лекцыю з прэзентацыяй. На сённяшні дзень створана ўжо 16 тэматычных электронных выставак, разлічаных на розныя ўзроставыя групы. Пры гэтым неабходна адзначыць, што іх колькасць пастаянна павялічваецца. Многія з іх ствараюцца на аснове стацыянарных выставак, якія праходзяць у музеі.

Такім чынам, музейныя выстаўкі ва ўсіх іх відах і формах з'яўляюцца асноўным спосабам музейнай камунікацыі. Яны даюць магчымасць прэзентацыі зместавай работы музея і дазваляюць яму вызначыць для сябе новыя групы наведвальнікаў. Выстаўкі могуць прыцягнуць увагу да музея і павысіць яго папулярнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Панченко, А. С.* Музейная экспозиция: вопросы методики и практики / А. С. Панченко // Современное искусство в контексте глобализации: наука, образование, художественный рынок : материалы II Всерос. науч.-практ. конф., 30 янв. 2009 г. – СПб. : СПбГУП, 2009. – С. 64–66.

2. *Пилко, И. С.* Электронные выставки музеев: специфические особенности, видовая классификация / И. С. Пилко, С. В. Савкина.

3. *Подорожная, Е. А.* Понятие «выставка» в современном музееведение / Е. А. Подорожная. – С. 145–150.

4. Российская музейная энциклопедия. – М. : Прогресс, РИПОЛ классик, 2005. – 848 с. – Ил. – С. 126.

## ТРАКТОВКА ОБРАЗА МУЗЫКАНТА В ИЗОБРАЗИТЕЛЬНОМ ПРОСТРАНСТВЕ

***В. П. Прокопцова,***
*доктор искусствоведения, профессор,*
*заведующий кафедрой белорусской и мировой художественной культуры*
*учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

Трактовка художественного образа в творчестве современных художников реализуется по-разному. Некоторые, размышляя над метаморфозами современного мира, создают произведения, где неоднозначность содержания, катастрофические события передаются реалистически, правдоподобно, через свойства художественной формы – изломанной, дисгармоничной, диссонансной, с хаотичной композицией, мрачным колоритом. Другие прибегают к условности, ассоциативности, символике, знаковости, лишь опосредованно касаясь трагических событий XX в., создавая при этом холсты особой декоративной красоты, полные внутреннего напряжения. В этом случае реальность не копируется, а осмысляется художником, который воплощает образы своей фантазии, рожденные на основе глубоких размышлений о современной действительности.

Отображение музыкальных образов всегда несет на себе печать личности того или иного художника, его времени и художественного стиля в определенном историческом контексте. Стремление художника передать свои впечатления, настроения в наиболее полном комплексе восприятия мира – акустического (интонационного) и визуального, звукового и цветового – провоцирует обращение к новым образам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ